ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

№16 (1069)
ЧАЦВЕР, 7кастрычніка 2004 г.
Выходзіць два разы ў месяц
Цана дагаворная

Газета заснавана ў верасні 1969 года

## СУСТРЭЧА З МІНІСТРАМ ЮСТЫЦЫІ

***Яна адбылася нядаўна ў актавай зале універсітэта, і яе ўдзельнікамі былі кіраўніцтва ГДУ, выкладчыкі і студэнты юрыдычнага факультэта.***

У сваім выступленні міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусі кандыдат юрыдычных навук, дацэнт В.Р. Галаванаў расказаў аб структуры міністэрства, якое ён узначальвае, яго ролі і значэнні ў нашай краіне. Дэталёва асвятляліся шматлікія функцыі міністэрства, асноватворнай з якіх з'яўляецца законапраектная дзейнасць: ніводныя пастанова ўрада, Указ Прэзідэнта не прымаюцца без папярэдняй абавязковай прававой экспертызы. Ішла таксама размова аб сістэме натарыяту, аб адвакатуры, самых розных аспектах юрыдычнай практыкі.

Мы – напярэдадні важных палітычных падзей у жыцці нашай рэспублікі: выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ і рэспубліканскага рэферэндуму, адзначыў Віктар Рыгоравіч. Ён падрабязна расказаў пра вышэйшы заканадаўчы орган краіны і канстытуцыйнае права народа напрамую выказваць сваю волю пры прыняцці лёсавызначальных для краіны рашэнняў.

В.Р. Галаванаў адказаў на пытанні, зададзеныя яму студэнтамі – будучымі юрыстамі, пажадаў ім плённай карпатлівай вучобы, каб яны сталі сапраўднымі спецыялістамі, з высокай прававой культурай.



**НА ЗДЫМКУ: міністр юстыцыі В.Р. Галаванаў (другі справа) разам з кіраўніцтвам універсітэта і начальнікам упраўлення юстыцыі Гомельскага аблвыканкама (другі злева) В.У. Макарэвічам перад сустрэчай з калектывам юрыдычнага факультэта.**

Фота У. ЧЫСЦІКА.

## ОТКРОВЕННЫЙ РАЗГОВОР НА ПОЛЬЗУ ВСЕМ

**В нашем университете есть немало добрых традиций. Одна из них – встречи руководства ГГУ с коллективами преподавателей и студентов факультетов.**

С новым ректором ГГУ профессором А.В. Рогачевым они состоялись полгода назад. Что удалось сделать с тех пор по совершенствованию учебного процесса, развитию материально-технической базы университета, над чем работать дальше, чтобы достойно встретить знаменательную для нашего вуза дату – 75-летие со дня основания? Об этом недавно говорилось на очередных встречах руководства с коллективами факультетов. Деканы, их заместители рассказали о достигнутых на факультетах успехах, остающихся проблемах, ректор и проректоры ответили на многочисленные вопросы, заданные преподавателями и студентами.

Откровенный разговор о насущном, злободневном, безусловно, поможет более оперативному и успешному решению возникающих вопросов.

**(Ответы на наиболее важные, общие для всех факультетов вопросы, читайте в следующем номере нашей газеты).**

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На першым у гэтым навучальным годзе пасяджэнні Савета ГДУ па дакладу рэктара прафесара А.У. Рагачова абмеркаваны вынікі работы універсітэта ў 2003-2004 годзе і акрэслены задачы на новы навучальны год. Прынята адпаведнае рашэнне, якое прадугледжвае далейшае ўдасканальванне вучэбнага працэсу, развіццё і шырокае прымянне розных метадаў самастойнай работы студэнтаў, інфармацыйных тэхналогій. Пастаўлена задача пашырыць пералік спецыяльнасцей і спецыялізацый, па якіх ажыццяўляецца набор студэнтаў, з улікам запатрабаванасці спецыялістаў, актывізаваць работу па развіцці матэрыяльна-тэхнічнай, лабараторнай базы універсітэта. І надалей, адзначаецца ў прынятым рашэнні, вялікую ўвагу неабходна ўдзяляць выхаваўчай і інфармацыйна-аналітычнай рабоце: ствараць інфармацыйныя групы на кожным факультэце, узмацняць прапаганду здаровага ладу жыцця, матэрыяльна заахвочваць куратараў студэнцкіх груп, выкладчыкаў, якія прымаюць актыўны ўдзел у рабоце з моладзю.

З інфармацыяй аб рабоце прыёмнай камісіі ГДУ па набору студэнтаў ва універсітэт у 2004 г. выступіў сакратар прыёмнай камісіі С.І. Ханеня.

У сувязі з тым, што з бягучага навучальнага года ў ГДУ адкрылася магістратура, на Савеце ўнесены і прыняты дапаўненні і змяненні ў Статут універсітэта. Па гэтым пытанні выступіў першы прарэктар Ю.І. Кулажанка.

На Савеце былі абраны 9 дэлегатаў ад Гомельскага дзяржуніверсітэта на І з'езд вучоных Рэспублікі Беларусь, які праходзіць гэтымі днямі ў г. Мінску. Нашу вну на гэтым форуме прадстаўляюць рэктар д.х.м., прафесар А.У. Рагачоў, прарэктары па навуковай і вучэбнай рабоце прафесары Д.Р. Лін, І.В. Семчанка, загадчык кафедры алгебры і геаметрыі д.ф.-м.н., прафесар, член-карэспандэнт НАН Б Л.А. Шамяткоў, загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды д.б.н., прафесар, член-карэспандэнт НАН Б Р.Р. Ганчарэнка, загадчык кафедры МПК д.т.н., прафесар І.В. Максімей, загадчык кафедры беларускай мовы д.ф.н., прафесар А.А. Станкевіч, начальнік НДС к.ф.-м.н., дацэнт В.Р. Сафонаў і загадчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту к.п.н., дацэнт С.У. Сеўдалеў.

Разглядаліся і іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

### 17 ОКТЯБРЯ – ВЫБОРЫ В ПАЛАТУ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ НАЦИОНАЛЬНОГО СОБРАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ И РЕСПУБЛИКАНСКИЙ РЕФЕРЕНДУМ

## МОЛОДЕЖЬ ЗА СИЛЬНОЕ И ПРОЦВЕТАЮЩЕЕ ГОСУДАРСТВО

Активисты Белорусского республиканского союза молодежи вошли в состав окружных и участковых комиссий. Первичной организацией БРСМ нашего университета создал Штаб по подготовке к участию в выборах, референдуме, роль которого состоит в оказании помощи молодым гражданам Беларуси.

Штаб проводит работу по охвату наблюдателями-представителями БРСМ всех избирательных участков, где будут голосовать наши студенты.

Ведется работа по организации совместной деятельности Оперативного молодежного отряда дружинников и преподавателей и правоохранительных органов по обеспечению правопорядка накануне и в день проведения выборов и референдума.

ОО БРСМ разработало республиканскую программу молодежной инфолинии «Вопрос избирателя». По тел.: **8-017-222-37-37** вы можете задать интересующие вас вопросы о выборах в Палату представителей Национального собрания РБ.

С вопросами вы можете обратиться также на горячую телефонную линию первичной организации ОО БРСМ университета по тел.: **56 73 90.**

**ПРЕСС-ЦЕНТР КОМИТЕТА БРСМ (корп. 4, каб. 4 - 10, 56 73 90).**

*Дорогие друзья!*

Комитет ОО БРСМ ГГУ обращается к вам в канун предстоящего важнейших событий – выборов депутатов в Палату представителей Национального собрания Республики Беларусь и республиканского референдума. Наша организация, поддерживающая политику Президента Республики Беларусь и государства в целом, примет в них самое активное участие.

Надеемся, что молодые граждане страны воспользуются своим конституционным правом выбора и не останутся в стороне от таких ответственных мероприятий. Мы призывает всех молодых избирателей проявить свою гражданскую позицию и проголосовать за достойных кандидатов в депутаты, за людей, которым оказана высокая честь — представлять в парламенте и ваши интересы.

Активисты БРСМ и рядовые члены организации должны не просто занять соответствующую позицию в поддержке кандидатов, готовых честно и добросовестно выполнять наказы избирателей, организовать работу парламента на уровне требований нашего демократического государства, но и провести разъяснительную работу среди своих родных, близких, друзей о необходимости проявления волеизъявления через личное участие в выборах.

История дала нам уникальный шанс построить суверенное, сильное и процветающее государство. Но страну можно назвать сильной, когда граждане осознают и разделяют идеи и ценности общества, и когда, участвуя в управлении делами общества, они сами решают судьбу страны, приобретая уверенность в исполнении своих самых смелых, сокровенных желаний и идей.

## ... А ДУШОЙ МОЛОДЫ



1 октября в нашей стране отмечается День пожилых людей. По доброй традиции ректорат, профком, женсовет ГГУ приглашают в этот день в университет тех, кто многие годы своей трудовой биографии отдал нашему вузу, отсюда ушел на заслуженный отдых. В адрес убеленных сединами, но все же остающихся молодыми душой ветеранов труда, звучат теплые слова благодарности за их добросовестный труд. Им вручаются цветы и конверты с материальной помощью.

Так было и в этом году. В конференц-зале главного корпуса собрались приглашенные **(на снимке)**. «Вы очень много сделали для нашего университета, мы благодарны вам за это,» – отметил во время встречи с ними первый проректор Ю.И. Кулаженко. Он пожелал им крепкого здоровья и оптимизма еще на многие-многие годы, особо подчеркнул их важную роль в воспитании на высоких нравственных принципах нынешних студентов. Эту же мысль продолжил и председатель профкома Г.И. Воротницкий, который также тепло и сердечно приветствовал ветеранов труда.

И, казалось, разгладились морщинки на их лицах, а в глазах появились веселые искорки.

Живите долго и счастливо, наши дорогие!

**Фото В. ЧИСТИКА.**

## КАДРАВЫЯ ПРЫЗНАЧЭННІ

Загадам па універсітэту загадчыкам кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі прызначаны дацэнт **КРАЎЧАНКА Юрый Уладзіміравіч.**

Не! – тэрору

## НАШ ПАСІЛЬНЫ ЎКЛАД

Нядаўняя трагедыя, якая здарылася ў Паўночнай Асеціі, ускалыхнуда ўвесь свет. Жорсткасць і бесчалавечнасць тэрарыстаў абарвалі жыцці соцень дзяцей і дарослых, якія сабраліся 1 верасня на ўрачыстую лінейку ў адной са школ г. Беслана. Пакалечаны лёсы бязвінных мірных людзей, якім доўна яшчэ давядзецца залечваць нанесеныя ім і фізічныя, і душэўныя раны.

Людзі добрай волі, у тым ліку і ў нашай рэспубліцы, не пакідаюць у бядзе пацярпелых, аказваюць ім пасільную матэрыяльную дапамогу. На спецыяльны рахунак пералічваюцца грашовыя сродкі, якія накіроўваюцца ахвярам тэрору. Не застаўся ў баку ад гуманнай акцыі і калектыў нашага універсітэта: прафесарска-выкладчыцкім саставам, супрацоўнікамі, студэнтамі сабрана звыш 2,6 млн. рублёў.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую добрасумленную працу Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана вядучы лабарант кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін **ЯГОРАНКАВА Людміла** Іванаўна.

## ОБЪЯВЛЕНИЯ

**8 октября** в конференц-зале корпуса № 4 состоится конференция комитета ОО БРСМ ГГУ.

**Повестка дня:**

1. Об итогах работы первичной организации БРСМ (докладчик И. Казаков).
2. О работе по организации вторичной занятости в летний период 2004 г. (М. Фролов).
3. Об утверждении секретаря первичной организации (И. Казаков).
4. О деятельности БРСМ в университете (проректор по воспитательной работе С.И. Ханеня).
5. О республиканском референдуме и выборах в Палату Представителей Национального собрания Республики Беларусь третьего созыва.

Начало в 14.00.

**КОМИТЕТ БРСМ.**

***

**14 октября** в конференц-зале корпуса №4 состоится отчетно-выборная профсоюзная конференция преподавателей и сотрудников университета.

**Повестка дня:**

1. Отчет о работе профсоюзного комитета университета за 1990-2004 гг. (Докладчик – председатель профкома Г.И. Воротницкий).
2. Отчет о работе ревизионной комиссии (Председатель ревизионной комиссии Т.В. Ушак).
3. Выборы профсоюзного комитета университета.
4. Выборы ревизионной комиссии.
5 Выборы делегата на XXIII областную отчетно-выборную конференцию Белорусского профсоюза работников образования и науки.

Начало в 14.00.

**ПРОФКОМ ГГУ.**

Наши олимпийцы

# КОГДА СБЫВАЕТСЯ МЕЧТА...

**На XXVIII Олимпийских играх в Афинах в составе национальной олимпийской сборной боролся за победу в заплыве на дистанции 100 м вольным стилем студент 4 курса факультета физической культуры ГГУ им. Ф. Скорины, мастер спорта Станислав Неверовский. Сегодня он – гость нашей редакции.**



**– Станислав, как ты пришел в спортивное плавание?**

– 10 лет занимался и занимаюсь в бассейне «Волна» Гомельского спортивного клуба у тренера Сергея Андреевича Самошина. После окончания ДЮСШ №1 поступил в училище Олимпийского резерва, потом —в ГГУ. Поначалу не было серьезного намерения заниматься профессиональным спортом. Я благодарен своему тренеру по училищу Елене Михайловне Савчиц, которая всегда мне повторяла: «Я в тебя верю. У тебя все получится». Это была огромная поддержка, появилась уверенность в своих силах.

**– Какие соревнования тебе запомнились?**

– Отборный чемпионат Европы среди юниоров, который проходил в г. Минске. На второй день соревнований я выиграл заплыв на 200 м – и это стало подарком на мой день рождения. Пожалуй, это был один из самых счастливых дней в моей жизни.

**– Тренировки требуют особого образа жизни?**

– Да, у меня по две тренировки в день. Поэтому крепкий сон и хорошая еда – то, что нужно для поддержки формы.

**– Как ты попал на Олимпийские игры в Афины?**

– Сначала завоевал лицензию на Чемпионате Европы в Мадриде, затем был этап Кубка мира в Москве, потом – участие в чемпионате республики. Это были своеобразные подступы к главной цели – Олимпийским играм. А затем – тренировки в Минске, Ялте, Словении и непосредственно в Афинах.

**– Что ты чувствовал во время соревнований?**

– Я стартовал 17-19 августа. Как только вышел к воде, ощутил смешанное чувство радости и гордости. Ведь любой спортсмен мечтает попасть на Олимпийские игры. И когда мечта сбывается, ты понимаешь, что все жертвы были не напрасны. Главное – дан шанс проявить себя. И когда над головой чистое небо, вокруг – одобрительные возгласы болельщиков, а впереди – синева воды – не передать словами, что чувствуешь в этот момент.

**– Как ты оцениваешь свое выступление?**

– Моей задачей было повторить свой рекорд: 100 м вольным стилем проплыть за 50,36 сек. и 50 м – за 23,13 сек. Я его повторил – и мое руководство осталось довольно. Я не собираюсь искать какие-то внешние причины в результатах моего участия: причину всегда нужно искать в себе. Я сделал все, что мог в тот момент.

**– Как греки относились к белорусским спортсменам?**

– Очень доброжелательно; ко всем спортсменам одинаково хорошо. Улыбались, здоровались, брали автографы. Там организовывали бесплатные экскурсии, с нами всегда был переводчик. Запомнился Акрополь и православная церковь, где освятили флаг нашей Национальной команды.

**– Как складывались отношения между жителями Олимпийской деревни?**

– Мы были одна семья, независимо от национальностей и спортивных амбиций. По соседству с нами жили китайцы и кубинцы. Хорошие ребята. На наших глазах зажигались звезды мирового спорта, и это были наши друзья. Конечно, мы очень радовались за наших чемпионов Игоря Макарова и Юлию Нестеренко.

**– Каковы твои планы?**

Рассчитываю в декабре поехать на чемпионат Европы по короткой воде в Вену, выполнить норматив мастера спорта международного класса, впереди также этапы Кубка Мира.

**– Что придает силы?**

– Стремление победить.

**– Удачи тебе, Игорь, в осуществлении всех задуманных планов.**

**Беседовала Т.ЦЕЛЕХОВИЧ.**
**Фото В. ЧИСТИКА.**

# АДКРЫЦЦЁ НОВАЙ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ – ПАТРЭБА ЧАСУ

**З гэтага навучальнага года на факультэце псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі, пры кафедры псіхалогіі функцыянуе новая спецыялізацыя – "Спартыўная псіхалогія".**

**Падрабязна аб гэтым я пагутарыла з яго дэканам, кандыдатам псіхалагічных навук М.У. Гапановіч-Кайдалавым і загадчыкам кафедры псіхалогіі, кандыдатам педагагічных навук А.А. Лытко.**

Па-першае, трэба растлумачыць агульны змест назвы: спартыўная псіхалогія забяспечвае працэс фарміравання гарманічнай асобы ў спорце, здольнай да аналізу і гатовай самой вырашаць узнікаючыя праблемы. А нам вядома, што многія няўдачы спартсменаў звязаны з нізкай псіхалагічнай падрыхтоўкай, таму вынікам нярэдка становяцца траўмы, нервовыя зрывы.

Важна, што гэта першая спецыялізацыя ў межах спецыяльнасці "Псіхалогія" у рэспубліцы. Нягледзячы на гэта, падрыхтоўка прафесіяналаў у галіне спартыўнай псіхалогіі з'яўляецца вельмі перспектыўнай справай. Можна сказаць, што такі крок – патрэба часу, бо адным з прыярытэтных накірункаў дзяржаўнай палітыкі сёння з'яўляецца развіццё фізічнай культуры і спорту.

Трэба адзначыць і перадумовы адкрыцця такой спецыялізацыі. Да нядаўняга часу на факультэце фізічнай культуры і спорту нашага універсітэта існавала падобная – "Практычная псіхалогія". Выкладчыкамі кафедр тэорыі і методыкі фізічнай культуры, псіхалогіі, сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі быў назапашаны значны вопыт арганізацыі навучання і выкладання дысцыплін псіхалагічнага цыкла, напрацаваны багаты навуковы матэрыял. Але, на жаль, яна была закрыта.

Было вырашана ўзнавіць цеснае супрацоўніцтва кафедры псіхалогіі з кафедрамі спартыўных дысцыплін і тэорыі і методыкі фізічнай культуры.

Як расказалі мае субяседнікі, у канцы мінулага навучальнага года праводзілася апытанне сярод студэнтаў з мэтай даведацца, ці жадалі б яны атрымаць падрыхтоўку ў галіне спартыўнай псіхалогіі. Былі атрыманы шматлікія станоўчыя адказы і заявы на адпаведнае навучанне. Гэта зразумела: многія маладыя людзі цікавяцца спортам, нават маюць нейкія дасягненні, але звязваць жыццё толькі з фізічнай культурай не імкнуцца па розных прычынах. А такое сумяшчэнне здольна выклікаць вялікую цікавасць. Зразумела, што дысцыпліны будуць падзелены паміж двума факультэтамі. А пры падрыхтоўцы вучэбных планаў кіраўніцтва арыетавалася на адпаведныя Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта, у якім ёсць такая ж спецыялізацыя.

Перспектыўнае бачанне дазволіла заснавальнікам "Спартыўнай псіхалогіі" адразу паклапаціцца пра будучае працаўладкаванне сваіх выпускнікоў. Яны змогуць займаць розныя сур'ёзныя, прэстыжныя і цікавыя пасады.

Новая справа складаная і вельмі адказная. Яна патрабуе вялікіх інтэлектуальных, практычных і творчых намаганняў. Трэба апраўдаць спадзяванні студэнтаў і правільна рэалізаваць навуковы патэнцыял факультэтаў. Таму вельмі хочацца пажадаць поспехаў і ўдачы тым, хто зацікаўлены ва ўдасканаленні вучэбнага працэсу ў нашым універсітэце..

**Марына ДЖАЛАЯ.**

Школьная практыка: асабістае меркаванне

# НАСТАЎНІЧАЕМ, АБО ЗА ПАРТАЙ СЯДЗЕЦЬ ПРАСЦЕЙ

Можна не быць філосафам, каб зрабіць вынік, што жыццё хуткаплыннае, імклівае. Учора быў вучнем, а сёння сам павінен стаць па іншы бок настаўніцкага стала.

Вось ужо другі год я прыходжу на практыку ў школу. І кожны раз з'яўляецца шмат розных эмоцый ад блізкай сустрэчы з настаўніцкай прафесіяй. Калі адносіцца сур'ёзна да свайго часовага абавязку, то складанасці чакаюць на кожным кроку. А працаваць мне давялося ў 11 класе, з дарослымі, на першы погляд, людзьмі.

Зразумела, што жыццё ідзе і школьнікі мяняюцца. Напрыклад, дзеці сталі вельмі "слабенькія" фізічна – не могуць кожны дзень насіць на ўрокі падручнікі – ну хаця б адзін на дваіх! (Часцей у іх сумках змяшчаюцца цыгарэты ды гульнёвыя карты). І школьная настаўніца туды ж – з анёльскай усмешкай каменціруе: "А мае дзеці не ходзяць на ўрок з падручнікамі"! Толькі не дабілася адказу, чаму. А выкладчыкі універсітэта нас вучылі, што зрокавая памяць часта больш эфектыўная, чым успрыманне на слых.

Але цяжкасць не толькі ў гэтым. Калі я вучылася ў школе, то адзін толькі строгі погляд настаўніка прымушаў нас да канца ўроку "прыклеіцца" вачамі да сшытка. А зараз вучні думаюць, што я, напэўна, разглядаю іх модную вопратку. І не дапамагаюць ні "хвіліны маўчання," ні "стальны" позірк і "метал" у голасе.І ўвогуле, не падабаюцца ім коласаўскія "трылогія" "Новая зямля" і "паэма" "На ростанях." А што ж рабіць студэнту-практыканту, калі яшчэ не заслужыў аўтарытэту? Застаецца распрацоўваць такія планы ўрокаў, каб вучням некалі было "Уздыхнуць". А так хочацца расказаць на ўроку шмат цікавага, патрэбнага, сур'ёзнага.

Таксама з мінулагодняй практыкі засталася вялікая праблема ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў, нягледзячы на ўсе метадычныя распрацоўкі і іншы дапаможны матэрыял. Зноў упэўнілася, што адзнакі лягчэй атрымоўваць, чым ставіць. Раней, напрыклад, гаварылі: "Сядай, "пяць!" А сёння кажаш проста "сядай", таму што адзнаку за адказ адразу выставіць даволі цяжка, ды нам і не раяць гэтага рабіць самастойна – спачатку трэба абмеркаваць з настаўнікам. А калі ў канцы ўрока не ацэньваць адказы вучняў, то нашмат цяжэй заахвоціць іх да актыўнай працы ў класе.

Сустракаюцца, канешне, сур'ёзныя і зацікаўленыя вучобай школьнікі. І тады вельмі хочацца працаваць толькі дзеля таго, каб кожны дзень бачыць іх разумныя і добрыя вочы.

**Марына СЕВЕР'ЯНАВА,**
**студэнтка 5 курса**
**філалагічнага факультэта.**

# МЫ – СТУДЭНТЫ БЕЛАСТОЦКАГА УНІВЕРСІТЭТА

**Нядаўна горад Гродна сонечным прыветным надвор'ем сустракаў 67 прадстаўнікоў з усёй Беларусі, якія сабраліся тут, каб паспрабаваць свае сілы і аказацца ў ліку студэнтаў Беластоцкага універсітэта (Польшча).**

У бягучым годзе тут праводзіўся набор на дзве спецыяльнасці завочнай формы навучання: педагогіка культуразнаўчая і педагогіка малодшых класаў.

Абітурыентам неабходна было вытрымаць два экзамены: сачыненне на польскай мове і кваліфікацыйная размова.

Удвая прыемна адзначыць, што, паспяхова вытрымаўшы іспыты, сярод будучых навучэнцаў аказаліся чатыры прадстаўнікі Гомельскага дзяржуніверсітэта: студэнткі 4 курса філалагічнага факультэта Валянціна Ісаенка і аўтар гэтых радкоў, а таксама чацвёртакурсніца гістарычнага факультэта Наталля Сіротка і дацэнт кафедры беларускай мовы Рыгор Уладзіміравіч Серыкаў.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, звязаныя з навучаннем у двух універсітэтах, мы прыкладзем максімум намаганняў, каб годна прадставіць сваю alma mater на еўрапейскім узроўні. Спадзяемся, гэта стане моцным падмуркам для далейшага развіцця і ўдасканалення нашых ведаў па польскай мове і культуры.

**Ірына СОЙКА,**
**студэнтка гр. БА-43**
**філалагічнага факультэта.**

**P.S. Напамінаем, што з 8 кастрычніка гэтага года будуць працягваць сваю работу двухгадовыя курсы польскай мовы для студэнтаў і выкладчыкаў нефілалагічных спецыяльнасцей.**

**Даведкі па тэл.: 55-62-29.**

Конгрессы и собрания

# ЗЕМЛЯ У НАС ОДНА

**Нынешний 2004-й год для географов примечателен рядом судьбоносных мероприятий. Так, в августе в г. Глазго состоялся XXX Всемирный географический конгресс, девиз которого «Одна Земля – много миров» во многом определяет суть современной географии в эпоху глобализации.**

А в эти дни (с 4 по 8 октября) в г. Минске проходит Белорусский конгресс географов, посвященный 70-летию географического факультета БГУ. В программе конгресса VII съезд Белорусского географического общества и Международная научная конференция «География в XXI веке: проблемы и перспективы". В его работе принимают участие и гомельские географы. Делегатами съезда избраны 9 человек (в том числе проректор университета по учебной работе, к.г.н., доцент О.А. Малахов, зав. кафедрой географии, к.п.н., доцент Г.Н. Каропа, доцент кафедры географии А.И. Павловский, автор этих строк и студент 5 курса А. Соколов).

На конференции представлены доклады преподавателей нашего университета: О.А. Малахова, А.И. Павловского, И.И. Богделя, И.О. Прилуцкого, Т.А. Шафаренко, Т.Г. Флерко, С.В. Прилуцкой, Ж.В. Шныпарковой, В.Е. Пашука, В.Н. Веремеева и Н.В. Веремеева.

В преддверии общереспубликанского конгресса в г. Гомеле, в главном корпусе нашего университета в конце минувшего месяца (23-25 сентября) прошли мероприятия, подведшие итоги работы географов Гомельщины за последние годы: IX отчетно-выборное собрание областного отдела БГО и Международная научно-практическая конференция «Непрерывное географическое образование: новые технологии в системе высшей и средней школы».

На конференцию были представлены 74 доклада. Их авторы – учителя гомельских школ, преподаватели вузов, видные ученые-географы. К сожалению, не все смогли приехать и выступить. Однако прозвучавшие на пленарном заседании доклады проф. Н.К. Чертко (БГУ) о структуре и содержании учебного плана по географии в вузах страны (в соавторстве с деканом геофака БГУ профессором И.И. Пирожником,), о задачах географии в реализации концепции устойчивого развития (доц. Г.В. Ридевский, г. Могилев), о проблемах преподавания исторической географии (доктор наук В. Бобрык, Бяла-Подляская Академия, г. Седльце, Польша) были с большим интересом выслушаны участниками конференции, а также студентами нашего геофака.

Было заслушано также около 20 докладов на секционных мероприятиях (современные методики преподавания географии в школе, проблемы организации учебных географических практик, вопросы кружковой работы, туризма и др.).

Участники конференции приняли резолюцию, в которой, наряду с отмеченными успехами в развитии географического образования, высказаны тревожные мысли в связи с сокращением числа уроков географии в школе, изъятием географических дисциплин из числа общеобразовательных курсов на экономических, исторических и сельскохозяйственных факультетах. Тогда как в эпоху глобализации, мировой экономической интеграции роль географического образования должна возрастать: ведь, как известно, «без географии мы нигде».

Созвучные идеи были высказаны и на собрании областного отдела общества географов его действительными членами (их число более 80 специалистов-географов и представителей смежных специальностей).

Гомельский отдел Белорусского географического общества был создан в 1976 г. В его деятельности были и периоды активной творческой работы, и кризисные годы. Но координация работы географов в регионе немыслима без этого общественного объединения.

На IX отчетно-выборном (XIII общее) собрании отдела БГО были избраны Ученый совет, Ревизионная комиссия, 9 делегатов на VII республиканский съезд. Новым председателем Ученого совета стал авторитетный ученый и опытный педагог, к.г.н., доцент кафедры географии нашего университета А.И. Павловский.

**В. ПАШУК,**
**ст. преподаватель кафедры географии,**
**ученый секретарь Гомельского**
**областного отдела ОО «БГО».**

